УДК 630*6

А.В. Зубкевіч, малодшы навуковы супрацоўнік

# ПРЫНЦЫПЫ АРГАНІЗАЦЫІ ЛЕСАНАРЫХТОЎЧАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ ВА ЎМОВАХ СТАНАЎЛЕННЯ РЫНКАВАЙ ЭКАНОМІКІ

The principles of logging organization under market condition are discussed in this article.

Структурная перабудова народнай гаспадаркі і эканамічныя рэформы вызвалі сур'ёзныя эканамічныя праблемы на прадпрыемствах ляснога комплексу. На дадзены момант на гэтых прадпрыемствах адчуваецца недахоп капітальных укладанняў на мадэрнізацыю і рэканструкцыю вытворчасці, недастатковы ўзровень укаранення перадавых тэхналогій і тэхнікі, недахоп абаротных сродкаў, нізкі ўзровень рэнтабельнасці. Уважлівы аналіз вытворчай структуры ляснога комплексу паказвае, што найбольш слабымі яго звёнамі з'яўляюцца лесанарыхтоўкі і глыбокая перапрацоўка драўніннай сыравіны. Між тым прадпрыемствы лесанарыхтоўчай галіны займаюць ключавыя пазіцыі ў структуры ляснога комплексу, і недахопы ў іх развіцці стрымліваюць станаўленне астатніх лясных прадпрыемстваў. Так, на долю лесанарыхтоўчай прамысловасці ў сукупным аб'ёме лесапрамысловага комплексу прыходзіцца 13,5%, каля 15,7% асноўных фондаў і 13% прамыслова-вытворчага патэнцыялу [1]. Пры гэтым каля 2/3 лесанарыхтоўчых прадпрыемстваў з'яўляюцца нерэнтабельнымі, знос асноўных фондаў складае ў сярэднім 70–80%. Акрамя эканамічных праблем, якія датычацца ўсёй прамысловасці рэспублікі, у лесанарыхтоўшчыкаў існуе шэраг спецыфічных фактараў, што прывялі да зніжэння аб'ёмаў вытворчасці. Гэта, па-першае, імклівае скарачэнне попыту на драўніну, калі рэсурсы па лісцёвай драўніне застаюцца амаль незапатрабаванымі. Па-другое, акцыяніраванне лесанарыхтоўчых прадпрыемстваў, калі пры змене ўласніка вымушаны былі адцягваць грашовыя сродкі на выкуп у дзяржавы асноўных фондаў і вытворчых плошчаў, тым самым запавольваючы працэс абнаўлення тэхнікі. Па-трэцяе, забарона лесанарыхтоўчым прадпрыемствам прадаваць лес у круглым выглядзе, што не дазваляе ім тэхнічна пераўзброіцца і палепшыць сваё фінансавае становішча. Склалася такая сітуацыя, пры якой лесанарыхтоўшчыкі вымушаны займацца перапрацоўкай драўніны – лесапілаваннем, вырабам тары, выпускам мэблі – тым, што для іх не характэрна [2].

Новыя патрабаванні спажыўцоў і ўзрастаючая канкурэнцыя як унутры краіны, так і за яе межамі ствараюць неабходнасць ва ўдасканаленні эканамічнай арганізацыі прадпрыемстваў ляснога комплексу, павышэнні іх канкурэнтаздольнасці. Неабходныя комплексныя, сістэмныя пераўтварэнні ва ўсіх сферах лесапрамысловага комплексу.

У лесанарыхтоўчай галіне такія пераўтварэнні павінны адбывацца на аснове пэўных прынцыпаў, сярод якіх галоўнымі, на наш погляд, з'уляюцца:

1. **Стварэнне і рэалізацыя праз заканадаўчыя акты эканамічных інтарэсаў для ўсіх суб'ектаў лясных адносінаў у заробку фінансавых сродкаў праз карыстанне ляснымі рэсурсамі.**

З тэорыі і практыкі лесаводства вынікае, што высечка, пасадка і вырошчванне лесу выступаюць як адзін працэс лесаўзнаўлення. Таму развіццё лесанарыхтоўчай вытворчасці неабходна разглядаць у цеснай узаемасувязі з ляснoй гаспадаркай. Лясная гаспадарка павінна быць прыбытковай. Толькі тады лесавод будзе імкнуцца да паляпшэння якаснага складу і ўзроставай структуры лясоў, павышэння іх прадукцыйнасці, калі ён будзе эканамічна зацікаўлены ў канчатковых выніках сваёй дзейнасці. Для гэтага патрэбна перабудова эканамічнага механізму фінансавання ляснoй гаспадаркі. Даход ад рэалізацыі драўніны павінен пералічвацца на рахунак лягаса, а замест яго ў бюджэт будзе

пералічвацца лясны падатак. Патрэбны перагляд дзеючых падаткавай і фінансавай сістэм галіны. Рэалізацыю драўніны на корані належыць праводзіць шляхам арганізацыі аўкцыёнаў з пераходам у перспектыве да рэалізацыі драўніны ў нарыхтаваным выглядзе. Неабходна перагледзець функцыі леспрамгасаў. На нашу думку, мэтазгодным з'яўляецца паступовы пераход ад сістэмы адносінаў паміж лясгасамі і леспрамгасамі на аснове набыцця апошнімі тавару ў выглядзе лесу на корані да сістэмы адносінаў, калі леспрамгасы будуць выступаць як падрадчыкі на выкананне лесанарыхтовак з магчымасцю набыцця драўніны па рынкавых цэнах з мэтай яе далейшага продажу [3].

2. **Арганізацыйна-эканамічнае аддзяленне тэхналагічна адасобленых вытворчасцей.**

Гэты прынцып вынікае з аналізу вопыту арганізацыі лесанарыхтовак у краінах з развітай эканомікай. Такі вопыт сведчыць, што перадача выканання большасці вытворчых функцый малым фірмам, прадпрымальнікам дазволіла значна падняць эфектыўнасць вытворчасці, канкурэнтаздольнасць, знізіць выдаткі. У адносінах да леспрамгасаў гэта можа быць раздзяленне прадпрыемстваў на больш дробныя фірмы, арганізацыйна-эканамічнае адасабленне лесанарыхтоўчых брыгад, прыцягненне да выканання лесанарыхтоўчых работ іншых спецыялізаваных прадпрыемстваў, фірмаў. Каму дастанецца падрад на правядзенне лесанарыхтовак – лясгасу, прыватным фірмам, леспрамгасу, будзе вырашацца на падставе канкурэнцыі паміж імі. Навошта вырабляць самім, калі гэта можна купіць больш танна і з лепшай якасцю? Гарантыя таму – сама магчымасць выбару выканаўца лесанарыхтоўчых прац.

3. **Вытворча-эканамічная самастойнасць прадпрыемстваў.**

На цяперашні час склалася сітуацыя, калі дзяржава жорстка кантралюе дзейнасць лесанарыхтоўчых прадпрыемстваў, рэгламентуе асартымент прадукцыі, узровень рэнтабельнасці вытворчасці, цэны на прадукцыю, рэгулюе пастаўкі ўнутры краіны, адсутнічае эканамічная свабода пры ажыццяўленні знешнеэканамічнай дзейнасці. Між тым вядома, што эканоміка любой краіны будуецца на аснове законаў рынку і дзяржаўнага рэгулявання. У выпадку, калі адбываецца значная перавага той ці іншай формы, непазбежны эканамічны крызіс. Вопыт развітых краін паказвае, што дзяржава не павінна ўмешвацца ў дзейнасць прадпрыемстваў. Яе задача – займацца вырашэннем праблем на макраўзроўні [4].

4. **Адчыненасць да інавацый, гнуткасць сістэмы кіравання і вытворчай структуры прыдпрыемства.**

Эфектыўнасць дзейнасці прадпрыемстваў лесанарыхтоўчай галіны прадвызначаецца стратэгіяй іх развіцця, адной з састаўляючых якой з'яўляецца фарміраванне такой структуры вытворчасці, якая б максімальна поўна адпавядала патрабаванням рынку і была дастаткова гнуткай, каб рэагаваць адпаведна на іх змены. Рынкавы характар эканомікі патрабуе змен прынцыповых падыходаў да фарміравання асартыменту прадукцыі. Неабходна выкарыстоўваць стратэгію арыентавання на спажыўца, калі выраб той ці іншай прадукцыі адбываецца ў адпаведнасці з існуючым попытам на рынку. Так, пры нарыхтоцы драўніны могуць выкарыстоўвацца два метады: 1) у адпаведнасці з існуючымі цэнамі на лесаматэрыялы на рынку; 2) у адпаведнасці з патрабаваннямі канкрэтнага спажыўца.

Удасканаленне сістэмы кіравання павінна ісці па шляху дэцэнтралізацыі, перадачы большых паўнамоцтваў нізавым звёнам, ліквідаванню шэрага непатрэбных і дубліруючых сістэм і падраздзяленняў.

5. **Кампетэнтнасць і прафесіяналізм персаналу.**

Ва ўмовах станаўлення рынкавай эканомікі, росту канкурэнцыі кампетэнтнасць і прафесіяналізм персаналу разглядаюцца як вырашаючы фактар павышэння эфектыўнасці вытворчасці. Істотнай праблемай з'яўляецца факт, што кіраўнікі і спецыялісты шматлікіх

прадпрыемстваў Беларусі не ў поўнай меры падрыхтаваныя да працы ва ўмовах рынкавага асяроддзя. Не хапае кваліфікаваных спецыялістаў у вобласці маркетынгу, менеджменту, стратэгічнага планавання. Для эфектыўнай працы ва ўмовах рынку лесанарыхтоўчым прадпрыемствам неабходна надаваць вялікую ўвагу падрыхтоўцы персаналу, пастаяннаму павышэнню яго прафесіяналізму. Таксама вельмі важна пастаянна павышаць кваліфікацыю і кампетэнтнасць прадпрымальнікаў, персаналу малых фірм, якія створаны (альбо будуць створаны) са структурных адзінак прадпрыемства. Вынікі дзейнасці прадпрыемства напрамую будуць залежыць ад эфектыўнасці іх працы.

Пры выкарыстанні гэтых прынцыпаў лесанарыхтоўчая галіна як складаная эканамічная сістэма будзе функцыянаваць больш эфектыўна і ў большай меры адпавядаць патрабаванням рынкавай эканомікі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Бирюкова В. Лесозаготовительная промышленность в условиях экономических реформ // Лесное и охотничье хозяйство. – 2003. – № 1. – С. 42 – 43.

2. Манкевич Н.В. Кто виноват и что делать // Лесное и охотничье хозяйство. – 2001. – № 4. – С. 8 – 10.

3. Алексеев А.С., Келломяки С., Любимов А.В. и др. Устойчивое управление лесным хозяйством: научные основы и концепции. – СПб.: ГЛТА, 1998. – 222 с.

4. Судник В. Лесопромышленный комплекс: пути совершенствования // Лесное и охотничье хозяйство. – 2003. – № 4. – С. 26 – 27.